# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

19 снежня 2025 г. № 442 г.Мінск

Аб прысуджэнні прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае ўмацаванню духоўных каштоўнасцей і маральных традыцый беларускага народа, патрыятычнаму выхаванню моладзі, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2025 года:

аўтарскаму калектыву ў складзе Арцюкоўскай Уладзіславы Ігараўны, мастацкага кіраўніка дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы ”Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ”Маладзёжны тэатр эстрады“, Лукашэнка Ганны Сяргееўны, паэта-песенніка, – за значны ўклад у захаванне гістарычнай памяці, умацаванне духоўных каштоўнасцей беларускага народа, стварэнне канцэрта-рэквіема ”Кожны трэці“;

аўтарскаму калектыву ў складзе Эйсманта Івана Міхайлавіча, Старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, Гарбаценкі Глеба Алегавіча, адказнага выпускаючага аддзела выпуску галоўнай дырэкцыі тэлеканала ”Першы інфармацыйны“ Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, Макей Вольгі Сяргееўны, намесніка галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі тэлеканала ”Першы інфармацыйны“ Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, – за стварэнне дакументальна-аналітычнага цыкла тэлефільмаў ”Время выбрало нас“;

калектыву адкрытага акцыянернага таварыства ”Белрэстаўрацыя“ – за захаванне і адраджэнне гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

калектыву Сінадальнага аддзела па царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльным служэнні Беларускай Праваслаўнай Царквы – за вялікі ўклад у справу пастырскай апекі духоўных патрэб дзяцей і дарослых, дабрачынную дзейнасць, развіццё новых напрамкаў сацыяльнага служэння царквы;

маёру міліцыі Шыпкову Віктару Уладзіміравічу, старшаму ўчастковаму інспектару міліцыі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі аддзела ўнутраных спраў Гомельскага райвыканкама, – за асабісты ўклад у адраджэнне, захаванне і папулярызацыю народнай творчасці, правядзенне этнаграфічных даследаванняў, рэканструкцыю традыцыйных святочных строяў паўднёва-ўсходняй часткі Гомельскага раёна.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць у 2026 годзе выплату прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2025 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад падаходнага падатку з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ • 1 •
Для правовых актов

10